УДК 947.6 «1905/1907»-057.4

П. В. Дзядзюля, дацэнт

# РЭВАЛЮЦЫЯ 1905–1907 ГГ. І ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ БЕЛАРУСІ

Growth and activization of the intellectuals of Belarus during the revolution of 1905–1907. The revolution of 1905–1907 resulted from complex and contradictional post-reform Russia development process assisted national liberation movement of empire nations. Vanguard for that time social and democratic ideas possessed minds of intellectuals first of all. Educated young people founded political, cultural and education societies, associations, parties, carried out agitation, fighted for national theatre, published newspapers, books and leaflets in native languages.

**Уводзіны.** Рэформы другой паловы XIX ст. паскорылі развіццё капіталізму ў царскай Расіі. Прамысловасць, сельская гаспадарка, адукацыя, культура, зарыентаваныя на еўрапейскія стандарты, узыходзілі на ўсё новыя вышыні. Іншыя рэаліі патрабавалі шмат адукаваных людзей. Айчынныя універсітэты не толькі рыхтавалі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, але прыцягвалі новыя еўрапейскія ідэі і, найперш, марксізм.

Груваcткая, кансерватыўная, са многімі перажыткамі мінулага, дзяржаўная сістэма імперыі была не ў стане эфектыўна выкарыстаць перавагі машыннай вытворчасці, вырашыць набалелыя палітычныя, сацыяльна-класавыя, нацыянальныя праблемы.

Менавіта расійская інтэлігенцыя найбольш адэкватна ўспрымала супярэчнасці развіцця капіталізму, актыўна шукала шляхі да гарманізацыі класавых, саслоўных, рэлігійных, нацыянальных адносін. Пэўная яе частка захапілася марксізмам і на яго аснове пачала ствараць рэвалюцыйныя арганізацыі, пры дапамозе якіх планавала ліквідаваць існуючую ўладу і пабудаваць справядлівае грамадства.

Палітычная эліта Расійскай дзяржавы аказалася няздольнай папярэдзіць збядненне насельніцтва, голад, бяспраўе і пры гэтым пачала вайну з Японіяй. Ігнараванне інтарэсаў абяздоленых, жахлівыя ахвяры ваеннага канфлікту падштурхнулі крывавую рэвалюцыю. Пасля студзеньскіх падзей 1905 г. у Пецярбургу яна ахапіла ўсю імперыю: ад яе прамысловых цэнтраў да нацыянальных ускраін.

Абуджэнне закранула і Беларусь. Выпускнікі расійскіх, еўрапейскіх універсітэтаў, вяртаючыся на Радзіму, прыўносілі ў грамадскую свядомасць новыя ідэі, стваралі палітычныя партыі, гурткі. Нацыянальна-вызваленчы рух становіўся найважнейшай задачай усіх рэвалюцыйных сіл края.

**Асноўная частка.** Першапраходцамі ў беларускім нацыянальна-вызваленчым руху ў пачатку XX ст. сталі браты Іван і Антон Луцкевічы. Закончылі Мінскую гімназію. Вучыліся ў Пецярбургскім універсітэце, які прыцягваў здольную моладзь з розных рэгіёнаў імперыі. Сярод студэнтаў мацнелі рэвалюцыйныя настроі, дзейнічалі зямляцтвы, культурна-асветныя арганізацыі, расла зацікаўленасць палітыкай.

Аднадумцам Луцкевічаў стаў Вацлаў Іваноўскі, студэнт тэхналагічнага інстытута. Вынікам іх творчага пабрацімства з’явіўся «Гурток беларускай народнай асветы», задачай якога стала друкаванне беларускіх кніжак і стварэнне беларускай школы [1].

Паступова Беларускі рух пашыраецца і ўсё больш палітызуецца. У 1903 г. з нацыянальных гурткоў гімназічнай, студэнцкай моладзі Мінска, Вільні, Пецярбурга арганізуецца Беларуская сацыялістычная грамада. Заснавальнікамі яе былі Іван і Антон Луцкевічы, Вацлаў Іваноўскі, Аляксандр Уласаў, Алесь Бурбіс і інш.

Кожны з заснавальнікаў прыўнёс у партыю сваё разуменне беларускай ідэі, свой вопыт, сваё бачанне перспектыў нацыянальнага адраджэння. Дзейнасць грамады напярэдадні і ў час рэвалюцыі пры нязначных матэрыяльных магчымасцях патрабавала самаахвярнасці.

Ужо ў першай палове 1905 г., калі рэвалюцыя мела заўважныя поспехі, БСГ павышае свой аўтарытэт, становіцца прыкметнай палітычнай сілай. Яна расце колькасна, фарміруе свае структуры, праводзіць агітацыйную работу, скіроўвае сялянскія стыхійныя выступленні ў арганізацыйнае русла, стварае сваю друкарню ў Мінску [2].

Большасць членаў першай беларускай палітычнай партыі былі неардынарныя асобы з высокім узроўнем інтэлекту, незвычайным нацыянальным пачуццём, адданымі любімай імі Беларусі, усебакова адоранымі людзьмі. Іван Луцкевіч – палітык, археолаг, этнограф, публіцыст. Антон Луцкевіч – палітычны і грамадскі дзеяч, гісторык, публіцыст, крытык [3].

Аляксандр Уласаў – грамадскі і культурны дзеяч, выдавец, публіцыст. Вучыўся ў духоўнай семінарыі, скончыў рэальнае вучылішча, атрымаў дыплом політэхнічнага інстытута ў Рызе. У час рэвалюцыі 1905–1907 гг. арганізоўваў забастоўкі, прымаў удзел у нелегальным настаўніцкім з’ездзе. Распрацоўваў аграрную частку праграмы БСГ на II з’езд (1906г.). Адзін з заснавальнікаў газет «Наша доля» і «Наша ніва». Сын паштовага служачага, небагатага шляхціча, рускі па паходжанню стаў адным з яркіх інтэлектуалаў беларускага адраджэння. За што і пазбавілі яго жыцця ў 1941 г. [4].

Гераізм і трагедыя паўстанцаў 1863–1864 гг. жылі ў памяці многіх беларусаў, давалі ім сілу для змагання. Карусь Каганец (сапраўднае прозвішча Казімір Карлавіч Кастравіцкі) нарадзіўся ў 1868 г. у Табольску ў сям'і ссыльнага. Яго бацька паходзіў з даўняга баярскага роду і быў раднёю Міхаіла-Апалінарыя Кастравіцкага, дзеда вядомага французскага паэта Гійома Апалінэра. Калі сыну Казіміру споўнілася чатыры гады, Кастравіцкія вярнуліся на радзіму. Вучыўся ў Мінскім гарадскім вучылішчы, скульптурным майстэрствам авалодваў у Маскве і Пецярбургу. Прымаў удзел у стварэнні БСГ, распрацоўцы яе праграмы. У сакавіку 1905 г. удзельнічаў у рабоце 1-га сялянскага з'езда Беларусі [5].

Актыўны ўдзел у рэвалюцыйных падзеях прыняла Цётка (Пашкевіч Алаіза Сцяпанаўна). Яркая постаць у гісторыі нашага народа, інтэлігентка ў першым пакаленні. Дзяўчынка з правінцыі з незвычайнай настойлівасцю, пераадольваючы матэрыяльныя цяжкасці, імкнулася да асветы. Скончыла 7-класнае вучылішча ў Вільні, у 1902–1904 гг. вучылася на курсах П. Лесгафта, у 1904 г. здала экстэрнам экзамены за курс Аляксандраўскай жаночай гімназіі ў Пецярбургу. Адна з заснавальніц і кіраўнікоў БСГ. Асабліва вядомымі былі яе рэвалюцыйныя вершы, якія ведала на памяць ледзьве не ўся працоўная Вільня. Твор «Хрэст на свабоду» друкаваўся ў дзесятках тысяч экзэмпляраў. Зімой 1905 г. удзельнічала ў рэвалюцыйных маніфестацыях ў Вільні [6].

17 кастрычніка 1905 г. цар Мікалай II адмяніў забароны, якія тармазілі развіццё нацыянальных моў у Расійскай імперыі, і абвясціў свабоды слова, сходаў, саюзаў. Для грамадска-палітычных структур у Беларусі з'явіліся рэальныя магчымасці пашыраць свае ідэі ў народзе.

1 верасня 1906 г. у Вільні з'явілася першая легальная беларуская газета «Наша доля». Тыраж яе быў 10 тыс. экземпляраў. Газета выклікала сенсацыю і вялікую цікавасць. За два дні ў Вільні было прададзена 3 тысячы экземпляраў, 5 тысяч трапіла ў правінцыю, а рэшту канфіскавала паліцыя. Чарговыя нумары выдання таксама канфіскавалі з прычыны радыкалізму прапагандаваных на яго старонках поглядаў на грамадскія справы [7].

Новы беларускі штотыднёвік «Наша ніва», каб пазбегнуць рэпрэсій, быў скіраваны на прапаганду асветы, распаўсюджванне разнастайнай інфармацыі. Газета дала пачатак сапраўднаму рэнесансу інтэлектуальнага жыцця ў Беларусі, стымулявала творчасць цэлай плеяды пісьменнікаў беларускага адраджэння – Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Алеся Гаруна і інш.

Штотыднёвік стаў найбольш значным асяродкам беларускага нацыянальнага жыцця. У рэдакцыі працавалі выдатныя беларускія літаратары, палітычныя дзеячы. Іх творчасць даходзіла ва ўсе куткі Беларусі і за яе межы. Беларуская ідэя, дзякуючы «Наша ніве», перастала быць элітарнай з'явай і станавілася паўсюднай.

Найбольш значнай групай інтэлігенцыі ў рэвалюцыйных падзеях былі настаўнікі. Рэвалюцыя паказала, што яны, як грамадска-палітычная сіла, арганічна звязаны з народам, найперш з сялянствам. Сваёй адукаванасцю, дасведчанасцю настаўнікі мелі на сялян вялікі ўплыў.

9–10 ліпеня 1906 г. у вёсцы Мікалаеўшчына Мінскага павета адбыўся з'езд настаўнікаў Мінскай губерні. Арганізатарамі з'езда былі Якуб Колас, Аляксандр Сянкевіч. Да іх прыехалі з розных школ Беларусі Янка Маўр, А. Райскі, Н. Янкоўскі і інш.

Удзельнікі з'езда былі арыштаваны паліцыяй, пазбаўлены пасад і больш за 2 гады знаходзіліся пад следствам. Часовае бюро працягвала сваю нелегальную дзейнасць [8]. Якуб Колас быў асуджаны на 3 гады турмы, яго зямляк Аляксандр Сянкевіч паспеў эмігрыраваць у ЗША. Янка Маўр доўгі час знаходзіўся пад наглядам паліцыі.

Пра неардынарнасць дэлегатаў з'езда сведчыць іх далейшы жыццёвы шлях. Якуб Колас, як вядома, стаў класікам беларускай літаратуры. Янка Маўр, рускі па нараджэнню і выхаванню, унёс немалы ўклад у беларускую літаратуру. Аляксандр Сянкевіч працаваў на розных прадпрыемствах ЗША, уключыўся ў рэвалюцыйную дзейнасць рабочых-эмігрантаў, стаў членам сацыялістычнай партыі, супрацоўнічаў у рэвалюцыйнай прэсе, скончыў медыцынскі факультэт Мэрылендскага універсітэта. У 1917 г. праз Японію трапіў на Далёкі Усход, дзе ўдзельнічаў у партызанскім руху. З 1921 г. наркам аховы здароўя БССР, займаў розныя партыйныя, дзяржаўныя пасады, выкладаў у БДУ. Нейкі час працаваў у Маскве. Высокаадукаваны, вопытны работнік з шырокім дыяпазонам прафесійнай падрыхтоўкі, з марксісцкім светапоглядам быў расстраляны ў Мінску 29 чэрвеня 1938 г. [9].

Рэвалюцыйны ўздым стварыў умовы для духоўнага распрыгоньвання народных мас і абумовіў з'яўленне творчых асоб у розных жанрах мастацтва.

На пачатку стагоддзя прыйшоў у мастацтва Язэп Драздовіч, юнак са шматдзетнай сялянскай сям'і. Пачынаў ён у 1906 г. у Віленскай рысавальнай школе І. Трутнева.

Лёс Драздовіча быццам паўтараў лёс яго Радзімы. Галодныя гады вучобы, беднасць, бяспраўе. Мастак імкнуўся паказаць гераічнае, прыгожае, светлае роднага краю. Тэматычны дыяпазон яго творчасці надзвычай шырокі. Карціны «Бежанцы», «Крэва», «Навагрудак», «Ліда», «Мір», «Гальшаны», партрэты Усяслава Чарадзея, Францыска Скарыны [10].

Уплыў рэвалюцыйных ідэй на развіццё грамадска-палітычнай актыўнасці беларусаў выклікала імкненне інтэлігенцыі да стварэння нацыянальнага тэатра. У той час па ўсёй Беларусі ўзніклі культурна-асветніцкія гурткі, у якіх аматары ставілі спектаклі, чыталі вершы і ўпотай вялі рэвалюцыйную прапаганду. Першай спробай арганізаваць беларускі народны тэатр стаў спектакль вясной 1906 г. у Пятроўшчыне пад Мінскам, які быў пастаўлены на беларускай мове па п'есе украінскага пісьменніка М. Крапіўніцкага «Па рэвізіі». Дзеянне выклікала захапленне гледачоў.

Царскія ўлады бачылі крамолу ў гэтай культурнай працы. Паліцыя забараніла дзейнасць першага тэатральнага калектыву, праследавала любую іншую працу нацыянальных гурткоў.

У такіх умовах пачынаў творчую дзейнасць таленавіты артыст, рэжысёр, адзін з заснавальнікаў беларускага прафесійнага тэатра Фларыян Ждановіч. Скончыў Мінскае рэальнае вучылішча, атрымаў дыплом Драматычнай школы ў Варшаве. Некалькі год працаваў у польскіх тэатрах.

З 1907 г. ён настойліва шукае шляхі да стварэння беларускага тэатра. Пераадольваючы забарону ўлад выступаць публічна на роднай мове, чытае вершы беларускіх паэтаў, сустракаючы шчырую падтрымку слухачоў. Арганізуе беларускую праграму пад назвай «Беларускі кірмаш» і паказвае яе мінчанам. Адначасова збірае драматычны калектыў і ставіць спектаклі на беларускай мове.

Справу Ф. Ждановіча працягваў І. Буйніцкі, які сфарміраваў Першую беларускую трупу, а пасля Народны беларускі тэатр у мястэчку Клёнікі Гродзенскай губерні. Такія ж калектывы існавалі ў Давыд-Гарадку, Слуцку і іншых пасёлках [11].

У бурныя рэвалюцыйныя часы пачынаўся творчы ўзлёт таленавітага артыста, рэжысёра, драматурга, мастака, музыканта Уладзіслава Галубка. Паходзіў з сям'і чыгуначніка. Пасля дачаснай смерці бацькі мусіў спыніць вучобу ў гарадскім вучылішчы і пайсці працаваць. Вучыўся ў вольны ад работы час, выпускныя экзамены за вучылішча здаваў экстэрнам. Удзельнічаў у драматычных гуртках у якасці акцёра. Займаўся атлетыкай у спартыўных таварыствах. Пачынае вучыцца музыцы, жывапісу, наведвае мастацкія выставы ў Маскве і Пецярбургу. Друкуе ў 1906 г. у «Нашай ніве» сваё першае апавяданне «На вяселле». З таго часу ён супрацоўнічае як пісьменнік у «Нашай ніве», «Маладой Беларусі» і іншых друкаваных беларускіх органах. Пазней выходзіць яго зборнік «Апавяданні».

У гэты ж час прымае актыўна ўдзел у падпольным гуртку РСДРП, які існаваў пры чыгуначным вузле Мінска. Стаў першым народным артыстам савецкай Беларусі. Расстраляны ў 1937 г. [12].

**Заключэнне.** Абмежаваны аналіз заяўленай праблемы не дае магчымасці раскрыць маштабы складанай узаемасувязі рэвалюцыйных працэсаў і дзейнасці нацыянальнай інтэлігенцыі, якая ў сваёй большасці ўпершыню змагла ўсвядоміць сябе часткай свайго абяздоленага народа і зрабіць пэўныя захады, каб узняць яго на больш высокі ўзровень палітычнай, культурнай і нацыянальнай свядомасці.

## Літаратура


1. Луцкевіч, А. І. За двадцаць пяць гадоў (1903–1928) / А. І. Луцкевіч. – Мінск, 1991. – С. 8.
2. Кароль, А. Ля вытокаў Беларускай сацыял-дэмакратыі / А. Кароль // Беларуская мінуўшчына. – 1996. – № 5. – С. 14.
3. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1997. – Т. 4. – С. 402, 404.
4. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 2003. – Т. 6, кніга І. – С. 578; Уласаў, А. Дні жыцця / А. Уласаў // Гісторыка-літаратурны зборнік. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1990. – С. 145.
5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1996. – Т. 3. – С. 521; Каганец Карусь. Творы / Карусь Каганец. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1979. – С.5–7.
6. Луцкевіч, А. І. За двадцаць пяць гадоў (1903–1928) / А. І. Луцкевіч. – Мінск, 1991. – С. 19; Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 2003. – Т. 6, кніга ІІ. – С. 11.
7. Мірановіч, Я. Найноўшая гісторыя Беларусі / Я. Мірановіч. – Санкт-Пецярбург, 2003. – С. 20.
8. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1997. – Т. 4. – С. 440
9. Іофе, Э. Адзін у чатырох іпастасях / Э. Іофе // Беларуская мінуўшчына. – 1997. – № 6. – С. 55–56.
10. Ліс, А. Вечны вандроўнік / А. Ліс. – Мінск: Юнацтва, 1984. – С.4–5, 13–15.
11. Слова пра майстроў сцэны. – Мінск: Беларусь, 1967. – С. 21–23; Атрошчанка, А. Фларыям Ждановіч / А. Атрошчанка. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1976. – С. 6–9.
12. Адхінуўшы заслону часу… Успаміны пра Уладзіслава Галубка / пад рэд. Л. Аляксандроўскай. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1979. – С. 3–6.